# План-канспект
## урока матэматыкі
## па тэме “Секунда” III клас

Хоміч Л.У., настаўнік пачатковых класаў
ДУА “Бабрыкоўская сярэдняя школа” Пінскага раёна

Задачы:

азнаёміць вучняў з новай адзінкай вымярэння часу – секундай; азнаёміць з суадносінамі паміж раней вывучанымі адзінкамі часу і новай адзінкай вымярэння;

паўтарыць вывучаныя адзінкі часу і рашэнне простых задач на вызначэнне часу з дапамогай гадзіннікавага цыферблата;

удасканальваць вылічальныя ўменні і навыкі;

замацоўваць уменні рашаць задачы вывучаных відаў.

### Ход урока

1.Арганізацыйны момант

- Давайце ўсміхнемся адзін аднаму. Я рада бачыць вашы ўсмешкі і думаю, што сённяшні ўрок прынясе нам радасць і задавальненне.

2.Дыхальная гімнастыка

- Кожная дзіцячая ўсмешка – гэта маленькі сонечны праменьчык

Я трымаю ў далоньцы сонца,
Я дару яго сябрам!
Усміхайся – гэта проста
Яркі праменьчык - гэта вам!

- Каб гэтыя праменьчыкі дакрануліся да кожнага з нас, прапаную мысленна пакласці іх на адкрытую далоньку. Набярыце поўныя грудзі паветра і падуйце на іх павольна, а цяпер з усёй моцы. Вашы ўсмешкі разляцеліся па ўсім класе, з добрым настроем пачнем наш урок.

3.Праверка дамашняга задання ст.33 №11. Дзеці здаюць сшыткі. У атрыманых сшытках запісваюць дату.

4.Матывацыя ўрока.

- Вам хочацца ведаць чым мы будзем займацца на ўроку? Тады паспрабуйце разгадаць рэбусы.

Ві3на, па3ёт, 100л

(на другім боку ліста запісана: лічыць, рашаць, адгадваць)

- Малайцы, адгадваць мы ўжо пачалі. Разгадаўшы крыжаванку мы даведаемся тэму ўрока.

Крыжаванка “Назаві адным словам”

1) Адна дзясятая частка сотні (дзясятак)

2) Сума даўжынь старон многавугольніка (перыметр)

3) Адзінка вымярэння даўжыні, роўная 1000 м.(кіламетр)

4) Лік, які з’уляецца вынікам складання лікаў  (сума)

5) Адзінка вымярэння часу (мінута)

6) Прамавугольнік, у якога ўсе стораны роўныя ( квадрат)

7) Адзінка вымярэння часу (гадзіна)




- Якое слова атрымалася? (Секунда)

5.Паведамленне тэмы і мэты урока

- Правільна. Давайце сфармулюем тэму ўрока? Адзінка вымярэння-секунда. Такім чынам, на ўроку мы з вамі пазнаёмімся з яшчэ адной адзінкай вымярэння часу - секунда, паўторым раней вывучаныя адзінкі часу і будзем удасканальвацца ў вылічальных навыках.

6.Работа над новым матэрыялам

- Што ж такое секунда? (Адзінка вымярэння часу)

- Якія адзінкі вымярэння часу мы ўжо ведаем ?(Мінута, гадзіна)

- Колькі мінут ў 1 гадзіне? (60)

- Дзе мы можам выкарыстоўваць гэтыя адзінкі вымярэння? У жыцці. Вялікае значэнне ў жыцці мае пачуццё часу, трэба вучыцца заўважаць час. “ І справе, і забаве – свой час.”

- А ведаеце, што чалавек вынайшаў гадзінннік вельмі даўно! (Так)

- Як вы думаеце, якія гадзіннікі былі першымі ?(Сонечныя)

- Як жа выглядалі першыя прыборы для вымярэння часу? На плошчах многіх гарадоў Грэцыі, Рыма, Вавілона ўзвышаліся вузкія, стройныя калоны. Пліты каля падножжаў калон былі расчэрчаны лініямі, лічбамі і знакамі.Так выглядалі першыя гадзіннікі (гноманы). Пліты – гэта

цыферблат, а стрэлку гноману замяняў цень, які калона адкідвала на пліты. Сонца рухалася па небе, разам з ім перамяшчаўся па цыферблаце і цень ад калоны. Любы жыхар зірнуўшы на цыферблат, мог даведацца, якая гадзіна. Але ўначы сонечны гадзіннік не працаваў. Існавалі зорныя гадзіннікі. (Паказ ілюстрацый)

- А затым прыдумалі....? (Вадзяныя гадзіннікі, пясочныя, агнявыя)
- Яны былі зручнымі? (Не)
- Вялізныя, ды недакладныя. А што рабіць, калі дзень пасмурны, ноч цёмная, вада замярзае, агонь згасае. Таму людзі прыдумалі гадзіннікі, якімі карыстаемся ўсе мы зараз.
- А якія гадзінннікі цяпер у нас ёсць? (электронныя, кішэнныя, насценныя, наручныя)

Паказваю гадзіннік з секунднай стрэлкай.

- Якія стрэлкі мы бачым на часах? Што адлічвае маленькая стрэлка? (Гадзіны)
- Што адлічвае вялікая стрэлка? (Мінуты)
- У нас ёсць яшчэ адна стрэлка, хто скажа, як яна называецца? (Секундная)
- Давайце паназіраем за рухам секунднай стрэлкі на працягу мінуты. Можна лічыць.(далічылі да 60)
- На ўроках фізкультуры вы бегаеце на час, выконваеце практыкаванні. Як называецца прыбор, якім карыстаецца настаўнік для вымярэння часу забегу? (Секундамер)
- Ён таксама падобны на гадзіннік, але яго цыферблат разлічаны на 1 мінуту, г. зн. колькі секунд? (60) (паказваю секундамер)
- Значыць, які зробім вывад? У адной мінуце колькі секунд? (у 1 мінуце 60 секунд)
- У 2 мін, 3 мін, 4 мін.?

Запіс на дошцы: <u>1 мін= 60 сек.</u>

7. Работа па падручніку.

№1.ст 34.Практычная работа.

- А што можна зрабіць за 1 секунду? (1 – 2 крокі)
- Давайте хорам называць лікі ад 20 да 30. Я засекаю па секундамеру. За 10 секунд вы паспели назвать 10 лікаў, значыць можна назваць адзін двухзначны лік за 1 секунду.

№ 2 ст. 34 (вусна)

№ 3 ст. 34 (пісьмова) Вучні па чарзе выконваюць пераўтварэнні адзінак вымярэння часу з тлумачэннем каля дошкі.

8. Замацаванне новага матэрыяла.

- А што можна паспець за 1 секунду? Адпачыць можна? 1 секунды мала, а 30 секунд дастаткова. Якая гэта частка мінуты? (палавіна, адна другая)

9. Фізкультмінутка

“Карабель касмічны новы,
Да палёту ўжо гатовы,
Калі ласка, аж да зор
Павязу цябе ў прастор.
Завялі маторы,злучылі кантакты,
Падрыхтаваліся да запуску ракеты,
Паляцелі!”

10. Работа над пройдзеным матэрыялам

- Зараз будзем рашаць задачы пра скорасць касмічнага карабля.

- Першая касмічная скорасць – 8 км/с. Другая касмічная скорасць большая за першую на 3 км/с. Якая яна? (11км/с)

- Майце на ўвазе, што ў карабля ёсць і трэцяя касмічная скорасць. Яна патрэбна для таго, каб пераадолець сонечнае прыцягненне і назаўжды пакінуць Сонечную сістэму. Яна большая за першую касмічную скорасць у 2 разы. Якая яна? ( 16 км/с.)

- Вернемся на Зямлю.

Работа па падручніку № 4, ст. 35 (вусна)

№ 8 (пісьмова, адзін вучань каля дошкі)

- Адгадвалі крыжаванку, рашалі задачы, зараз будзем лічыць

№6 ст. 35 (каменціраванае пісьмо)

Рашыць задачу:

Два трэцякласнікі – Оля і Толя –
Разам знаходзяць перыметр поля.
Ты дапамажы ў вылічэннях рабят,
Калі вядома, што поле-квадрат,
5 м-даўжыня стараны і няма ніякіх іншых дадзеных. ( 5*4=20)

№7 (пасля тлумачэння -самастойная праца, узаемаправерка)

Дамашняе заданне № 9, 10 ст. 35 (тлумачу)

11. Падвядзенне вынікаў.

-Уменне арыентавацца ў часе з’яўляецца паказчыкам выхаванасці і праяўляецца ў тым, што чалавек цэніць свой час і паважае час іншых. Ён не спазняецца пры пэўных сустрэчах, гаворыць толькі пра неабходнае. Кожная мінутка – гэта вялікае багацце, іх нельга траціць дарма. Запомніце прымаўку: “Страчаны марна час ніколі не вернеш…”

Мы на ўроку час марна не трацілі, а плённа працавалі і зрабілі шмат адкрыццяў па тэме “Секунда”, таму заслужылі пачастунак. У вазе ляжаць цукеркі. Рашаем задачу № 5 ст 35. (лагічнае мысленне) Адказ 12 цукерак.

(цукеркі дзелім пароўну на ўсіх вучняў)

12. Рэфлексія Прадоўжы сказ…

даведалася (ўся)…

Я

здзівілася (ўся)…
задумалася (ўся)…
паўтарыла (ў)…
навучылася (ўся)…
запомніла (ў)…

Верш С. Баруздзіна “Стихи  о человеке и его часах”.

Жадаю, каб вы вучыліся жыць па гадзінніку, цанілі і берaглі кожную секунду і з задавальненнем маглі сказаць: “Добры быў дзянёк!”